ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2021 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу на лепшага рэжысёра (рэжысёрска-пастановачную групу) культурна-масавага мерапрыемства**

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу на лепшага рэжысёра (рэжысёрска-пастановачную групу) культурна-масавага мерапрыемства (далей – Конкурс).
2. Мэтамі і задачамі Конкурсу з'яўляюцца: выяўленне і падтрымка наватарскіх плыняў у арганізацыі масавых мерапрыемстваў, фарміраванне і развіццё прафесійнай культуры рэжысёраў святаў і мерапрыемстваў, абагульненне і распаўсюджанне перадавога вопыту.
3. Арганізатарамі Конкурсу з'яўляюцца ўпраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама і ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".
4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей - аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (дадатак 1).
5. Аргкамітэт:
5.1. уносіць на разгляд упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне Конкурсу, умовах правядзення Конкурсу і відах заахвочвання ўдзельнікаў;
5.2. узгадняе склад рэжысёрска-пастановачнай групы, склад журы Конкурсу, спіс удзельнікаў Конкурсу, праграму правядзення Конкурсу, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку, план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні Конкурсу;
5.3. вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі Конкурсу;
5.4. вырашае іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем Конкурсу.
6. Конкурс праводзіцца на працягу 2021 года (падвядзенне вынікаў – у снежні 2021 г.).

7. У сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй арганізатарамі Конкурсу дапускаюцца змены ў дадзенай Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу на лепшага рэжысёра (рэжысёрска-пастановачную групу) культурна-масавага мерапрыемства.
8. У Конкурсе прымаюць удзел рэжысёры (рэжысёрска-пастановачныя групы) устаноў культуры клубнага (змешанага) тыпу.
9. Для ўдзелу ў Конкурсе прадстаўляецца заяўка ад раёнаў і г. Гродна (не больш 1), сцэнарый культурна-масавага мерапрыемства (тэматычныя канцэрты, святы, фестывалі, конкурсы), праграма, фота-, відэа-, рэкламная прадукцыя, спіс публікацый у СМІ.
10. Пры падвядзенні вынікаў Конкурсу журы (дадатак 2) карыстаецца наступнымі крытэрыямі: арыгінальнасць сцэнарыя і рэжысёрскага рашэння; разнастайнасць жанраў у мерапрыемстве; адпаведнасць музыкальнага афармлення яго тэматыцы; выкарыстанне інтэрактыўных прыёмаў; мастацкае афармленне і касцюміраванне мерапрыемства; выкарыстанне рэкламна-інфармацыйных рэсурсаў, інавацыйных форм, сучасных тэхнічных сродкаў; арганізацыя PR-дзейнасці ў сацыяльных сетках.
11. Журы Конкурсу вылучае лаўрэатаў (I, II, III ступені) і ўзнагароджвае іх прызамі і дыпломамі.
12. Журы ўзнагароджвае канкурсантаў спецыяльнымі прызамі і дыпломамі: “за лепшае выкарыстанне мясцовага матэрыялу”, “за арыгінальнае рэжысёрскае рашэнне”, “за лепшую сцэнаграфію”, “за лепшае выкарыстанне сучасных тэхнічных сродкаў”, “за лепшае выкарыстанне рэкламна-інфармацыйных рэсурсаў”.
13. Усе астатнія ўдзельнікі Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.
14. Журы пакідае за сабой права ў рамках агульнага прызавога фонду змяняць альбо ўводзіць іншыя спецыяльныя дыпломы.
15. Заяўка на ўдзел у Конкурсе (дадатак 3) дасылаецца ў ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” да 1 сакавіка 2021 года па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, тэл. +375 152 623803, +375 29 5873956, тэл/факс: +375 152 623787, e-mail: omcnt@mail.grodno.by
16. Астатнія конкурсныя матэрыялы дасылаюцца: сцэнарны план, праграма – за тыдзень да мерапрыемства; фота-, відэа-, рэкламная прадукцыя, спіс публікацый у СМІ – не пазней 10 дзён пасля правядзення мерапрыемства.
17. Фінансаванне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны

метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

18. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, дыпломаў.

19. Для фінансавання Конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога конкурсу
на лепшага рэжысёра
(рэжысёрска-пастановачную групу)
культурна-масавага мерапрыемства

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога конкурсу на лепшага рэжысёра
(рэжысёрска-пастановачную групу) культурна-масавага мерапрыемства

| | | |
|---|---|---|
| Куратчык С.В. | - | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Мурэня А.У. | - | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Багдановіч В.Т. | - | намеснік начальніка аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Грыгаран Т.У. | - | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Рабцава А.Л. | - | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога конкурсу
на лепшага рэжысёра
(рэжысёрска-пастановачную групу)
культурна-масавага мерапрыемства

СКЛАД ЖУРЫ
абласнога конкурсу
на лепшага рэжысёра (рэжысёрска-пастановачную групу)
культурна-масавага мерапрыемства

| | | |
|---|---|---|
| Куратчык С.В. | - | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта, старшыня журы; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, намеснік старшыні журы; |
| Багдановіч В.Т. | - | намеснік начальніка аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Буйко А.І. | - | выкладчык УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”; |
| Грыгаран Т.У | - | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Мурэня А.У. | - | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Рабцава А.Л. | - | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога конкурсу
на лепшага рэжысёра
(рэжысёрска-пастановачную групу)
культурна-масавага мерапрыемства

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры
райвыканкама
2021 г.

**З А Я Ў К А**
на ўдзел у абласным конкурсе на лепшага рэжысёра
(рэжысёрска-пастановачную групу)
культурна-масавага мерапрыемства

1. Раён________________________________________________

2. Базавая ўстанова ______________________________________

3. Прозвішча, імя, імя па бацьку рэжысёра (склад рэжысёрска-пастановачнай групы), пасада________________________________

________________________________________________________

________________________________________________________

________________________________________________________

4. Конкурснае мерапрыемства________________________________

5. Дата правядзення________________________________________

6. Кароткая характарыстыка мерапрыемства______________________

________________________________________________________

________________________________________________________

________________________________________________________

8. Кантактныя тэлефоны______________________________________

Кіраўнік базавай установы __________________
*(подпіс)*

Заяўку на ўдзел у конкурсе неабходна даслаць да 1 сакавіка 2021 года па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, тэл. +375 152 623803, +375 29 5873956, тэл/факс: +375 152 623787, e-mail: omcnt@mail.grodno.by.